УДК 82-14 Баравікова, Мацяш

*І.М. Гоўзіч, К.Т. Макарэвіч*

# АДЗНАКІ МЕДЫТАТЫЎНАСЦІ Ў ТВОРЧАСЦІ РАІСЫ БАРАВІКОВАЙ І НІНЫ МАЦЯШ

Артыкул прысвечаны даследаванню медытатыўнасці як сэнсаўтваральнай дамінанты лірыкі Раісы Баравіковай і Ніны Мацяш. На матэрыяле вершаў са зборнікаў Р. Баравіковай «Дрэва для райскай птушкі» і Н. Мацяш «Богава дрэва», «Душою з небам гаварыць», «Паміж усмешкай і слязой», «У прыгаршчах ветру» робіцца высноlва, што рэфлексія думкі і пачуцця аўтараў, іх рух, змены складаюць адметнасць лірыкі абедзвюх паэтэс. Ступень увасаблення медытатыўнасці ў творах Р. Баравіковай і Н. Мацяш выяўляецца ў двух аспектах: гэта і апісальнасць з адзнакамі медытатыўнасці, і «чыстая» медытацыя.

Сучасная філасофская лірыка – гэта ўжо не толькі і не столькі апісанне прыроды і рэалій жыцця, прапушчанае праз свядомасць і стан душы пісьменніка, пададзенае максімальна эмацыйна ці сцішана-лагодна. Гэта таксама і дыялог – дыялог з часам, аднаго аўтара з іншымі, аўтара з чытачом, з самім сабой, з «цэлым народам», са сваёй душой і з Богам. Яшчэ адна асаблівасць сучаснай лірыкі заключаецца ў тым, што думка не ляжыць на паверхні, а вынікае з глыбіні душэўнага вопыту як паэта, так і рэцыпіента, яна – пэўным чынам інтанаванае выказванне, якое залежыць ад прадмета ўвагі і адрасата. І ў той жа час лірыка застаецца аўтарскім маналогам, як ні парадаксальна, пабудаваным па законах дыялогу, скіраванага да рэцыпіента-чытача.

Лірыка ў нашы дні з'яўляецца надзвычай дынамічным і «рухомым» родам літаратуры яшчэ і па той прычыне, што ўмоўнасць у ёй максімальная, яна вольна карыстаецца не толькі катэгорыямі прасторы і часу (хранатоп), але і стварае іх псіхалагічныя двайнікі, бо галоўная задача пісьменніка – удала знайсці сугуччы слоў, што выклікаюць у свядомасці рэцыпіентаў чуйныя, складаныя, поўныя ўяўленні. Нам імпануе выказванне сучаснага літаратуразнаўца, што лірыка ніколі не зачынялася і не зачыняецца «ў сферы ўнутранага жыцця людзей, іх псіхалогіі. Яе нязменна вабяць душэўныя станы, што знамянуюць засяроджанасць чалавека на навакольнай рэчаіснасці» [1, с. 134]. У сваіх меркаваннях В.Я. Халізеў развівае назіранне Г.М. Паспелава пра лірыку, якая па-мастацку асвойвае «не толькі чалавечую псіхалогію і свядомасць, але і, натуральна, быццё» [2, с. 134].

Як нам думаецца, у развіцці лірычнага слоўнага мастацтва выразна вызначаюцца тры жанрава-стылявыя пачаткі – эмацыянальна-выяўленчы (прадметна-апісальны), дыдактычна-павучальны (нораваапісальны, эталагічны) і медытатыўны. Ступень іх праявы ў творчасці асобных аўтараў і ў канкрэтных творах неаднолькавая, залежыць ад многіх фактараў, адзін з якіх – фактар часу.

Медытатыўнасць, па словах Г.М. Паспелава, – найбольш выразная, дамінантная рыса лірыкі. Наконт гэтага вядомы літаратуразнавец адзначаў: «Лірыка можа быць пераважна скіравана да самааналізу, утрымліваць у сабе эмацыянальную ці мысліцельную рэфлексію» [2, с. 64]. Менавіта рэфлексія думкі і пачуцця аўтара, іх рух, змены складаюць адметнасць лірыкі як роду літаратуры. Заўважым, аднак, што медытатыўнасць па-рознаму ўвасабляецца ў творах: гэта і эмацыянальнасць, і апісальнасць з адзнакамі медытатыўнасці, і чыстая медытацыя. Часта ў падобных творах лірычны герой непасрэдна выяўляе свае пачуцці з пэўным элементам медытатыўнасці (разважлівасці), ці аказваецца поўнасцю падуладны самарэфлексіі, адгароджваецца ад рэцыпіента, нібы забываецца на яго, ці разважае пра лёс грамадства,

выказвае свае філасофскія погляды на жыццё і смерць, арыентуючыся на чытача, пастаянна маючы яго на ўвазе.

Медытатыўнасць у лірыцы становіцца заканамерным вынікам інтэлектуалізацыі многіх сфер грамадскага жыцця, бо нават тады, калі «лірычныя творы нібы пазбаўлены медытатыўнасці і знешне ў асноўным апісальныя, яны толькі пры той умове з'яўляюцца паўнацэнна мастацкімі, калі іх апісальнасць насычана медытатыўным падтэкстам» [3, с. 158]. У нашыя ж дні паглыбляецца асэнсаванне з'яў, на апісанне паводле эмацыйнага ўспрымання наслойваецца рацыянальны пачатак, з'яўляюцца творы, сканструяваныя часта фантазіяй мастакоў, камбінаванай пабудовы, своеасаблівыя аплікацыі з раней напісанага (постмадэрнізм). Мастакі слова часта ставяць перад сабой мэту – разбурэнне створаных раней ідэалаў прыгожага, гармоніі.

Узмацненне медытатыўнага пачатку ў лірыцы, на нашу думку, адбываецца тады, , калі «у <…> культуры непаўторная чалавечая асоба ўсведамляецца як каштоўнасць» [4, 315]. Такія спрыяльныя ўмовы ў соцыуме складваліся не адзін раз на працягу многіх тысячагоддзяў (і ў Антычнай Грэцыі, і ў эпоху Адраджэння), але найбольшае распаўсюджанне медытатыўнасць як адзнака літаратуры атрымала ў XIX – пачатку XX стагоддзя ў Расіі (Я.А. Баратынскі «Усё думка, ды думка! Мастак бедны на слова!», М.А. Някрасаў «Я за тое глыбока ненавіджу сябе…», А.С. Пушкін «Пара, мой сябар, пара! Пакою сэрца просіць…» і інш.), Еўропе (М. Метэрлінк «Запальнае шкло», А. Рэмбо «Зло», П. Элюар «Смерць. Каханне. Жыццё» і інш.) і на Беларусі (М. Багдановіч, З. Бядуля). Слоўная творчасць названых паэтаў сведчыць пра арыгінальны сінтэз думкі і пачуцця, канкрэтнага і абстрактнага як адметную рысу медытатыўнай лірыкі. Працэс разгортвання думкі, пачаты гэтымі мастакамі, працягваецца ў творчасці шматлікіх паэтаў пазнейшай пары – Р. Барадуліна («Абсяг», «Ксты»), А. Блока (цыкл вершаў «Ямбы»), А. Вярцінскага («Хлопчык глядзіць...»), М. Забалоцкага (вершы «Чытайце, дрэвы, вершы Гезіёда», «Запавет»), А. Куляшова (філасофскія элегіі са зборніка «Новая кніга»), А. Разанава (версэты, вершаказы, квантэмы, пункціры), А. Русецкага (вершы з кнігі «Яго вялікасць»), Я. Сіпакова (медытатыўныя элегіі са зборніка «У поўдзень, да вады»), М. Танка (вершы з кніг «Глыток вады», «Errata»), Н. Мацяш («У прыгаршчах ветру»), Р. Баравіковай («Дрэва для райскай птушкі») і інш.

Варта адзначыць, што ў наш час канчаткова выпрацаваўся варыянт медытатыўнай паэзіі, у якой адбываецца агульная актывізацыя мысліцельнай энергіі і канцэнтрацыя сапраўднага пачуцця дзякуючы ўшчыльненню яскравай выяўленчасці, асацыятыўнай вобразнасці, трапнасці мастацкіх дэталяў, якія ўдала працуюць на падтэкст, скандэнсаванасць зместу. Аднак ступень абстрагавання і медытатыўнасці ў творчасці сучасных беларускіх паэтаў значна большая, чым у іх папярэднікаў, а філасофская думка «ўціснутая» ў больш значны адрэзак часу, суаднесена з дасягненнямі мінулых эпох.

Раіса Баравікова – таленавітая мастачка, якая пастаянна ўдасканальвае свой стыль, сваю паэтыку, таму ў яе творчасці заўсёды адбываюцца змены, рух ад простага да складанага. Так, у межах аднаго жанру – элегіі – відавочна паступовая стылёвая эвалюцыя аўтара – ад апісальнасці, выяўленчасці да заглыблення ў сферу свядомага, напружанага асэнсавання рэчаіснасці з мэтай выяўлення яе істотных заканамернасцей, да самапаглыблення, медытатыўнасці.

У ранняй паэзіі Раісы Баравіковай пераважна разгортваецца матыў кахання, часта не ўзаемна-светлага, а горкага з адзнакамі самапаглыблення, самарэфлексіі. Найбольш выразна пазіцыя паэткі ў гэтым пласце лірыкі выявілася ў вершы «Зорка палявая». Думка верша выказана на хвалі вялікай эмацыянальнай напружанасці і шчырасці. На поўны голас, адзін за адным, раскрываюцца ў вершы – «згустку» пачуцця

і роздуму, эмацыянальным выдыху – разважанні і тэзісы, што пацвярджаюць зыходны, галоўны, – лірычная гераіня гатовая ахвяраваць усім, што мае, у імя кахання – нават стаць «зоркай палявой»:

*Калі ж узыдзе поўня караваем, –*
*пазбавіць сэрца смутку і нуды,*
*у ім пакіне зорка палявая*
*свайго святла гарачыя сляды.*

*Ласкава буду зваць яе сястрыцай,*
*у бездань неба кіньце свой пагляд...*
*Магчыма, зорка весняя іскрыцца,*
*а можа, я плыву за далягляд.* [5, с. 31].

Вобраз лірычнай гераіні Р. Баравіковай мае выразную аўтабіяграфічную аснову, у яе жыцці спалучаюцца радасць, перажыванні, трагедыі і расчараванні. Будучы жанчынай-летуценніцай, паэтка абрала асновай сваёй мастацкай творчасці адлюстраванне жывога, светлага і балючага, трапяткога пачуцця. Менавіта таму многія творы яе ўяўляюцца сапраўднай светлай «лебядзінай песняй» рамантычнай натуры, што ідзе небяспечным шляхам, нібы па вастрыі ляза, да ўласнага шчасця, ідзе праз пакуты, перажыванні, крыўды, страты і кожны раз з горыччу разважае: *«Хто я, што я на гэтым свеце?!»* [5, с. 263].

У зборніках «Люстэрка для самотнай», «Слухаю сэрца», «Каханне» побач з матывамі радасці і захаплення прыгажосцю становяцца матывы болю, заклапочанасці лёсам людзей і асабістым лёсам, трывогі з прычыны страты маральных каштоўнасцей у сучасным грамадстве. Лірычнай гераіні твораў цяжка прымірыцца з тым, што ападаюць белыя пялёсткі ў садзе, на змену дню прыходзіць змярканне, сонцу – хмары. Але падобны настрой яна пастаянна пераадольвае, верыць у Святло і Дабро. У вершы «За дзень да снежня» паэтка апісвае час, калі «па садах згалелых ходзіць крыўда», «дрэвы скардзяцца на золь», калі пануе ў сэрцы слата, аднак не страчвае надзеі на светлы дзень:

*Гартае свет турбот будзённых кнігу,*
*нямала ў ёй старонак для мяне,*
*і круціць лёс, нібы разводдзе крыгу,*
*не сплю... Чакаю сонейка ў акне.* [5, с. 206]

Вера ў гармонію і прыгажосць жыцця сцвярджаецца вобразам-архетыпам саду – сімвалам Радзімы, цэнтра сусвету, шчасця, чысціні, крыніцы музыкі, якая спрадвеку азначала гармонію. Менавіта ў садзе нараджаюцца плады, каханне: *«Перадам з душы ўтрапёнасць слову, // што ірвецца спуджана здалёк, // у шыпшыннік, пад тваю ахову, // быццам саду лёгкі матылёк»* [5, с. 76].

Паступова ў творчасці паэтэсы пабольшвае вершаў, якія сведчаць пра жаданне лірычнай гераіні стрымліваць пачуцці, асэнсоўваць іх і прыводзіць у стройную сістэму ўдумлівай і шчырай разважлівасцю, узмацняецца разважанне-роздум па філасофскіх праблемах. З'яўляюцца таксама трывожныя па змесце і інтанацыі медытацыі, прасякнутыя то лёгкім элегійным сумам, то нясцерпным болем:

*Дазвольце мне вярнуцца з лістападу,*
*з завеі ці з дажджу ў будзённы час,*
*каб доўг аддаць у глыбіню пагляду, –*
*замоўчанае:*
*«Я КАХАЮ ВАС...».* [5, с. 117]

Учытаемся ў радкі выдатнага твора ўважліва – і перад намі адкрыецца душа Жанчыны, надзвычай чыстая і светлая. Самотная, ні ў чым не вінаватая, гэтая блізкая

да блокаўскай Дамы-прыгажуні Жанчына не жадае зла таму, хто яе пакінуў, і просіць толькі аднаго – каб колішні каханы збярог светлыя імгненні, промні былых радасных сустрэч у сваёй душы.

Паэтка ў асобных сваіх творах узнялася на агромністую вышыню і вастрыню адчування не толькі асабістага – у каханні, – але і агульналюдскога, агульначалавечага болю. На матыў «люблю», такім чынам, нарошчваецца ўжо не матыў «сумую», а матыў «трывожуся». «Люблю» і «трывожуся» становяцца побач і, у сваю чаргу, дапаўняюцца яшчэ двума матывамі – «баюся» і «пакутую»: *«Жыцця пакутнага цяжар // не спакушаецца надзеяй, // навошта целу гэты жар, // калі душою халадзею?»* [5, с. 34].

Лірычная гераіня Раісы Баравіковай страсна, эмацыянальна разважае то пра няўмольны рух часу (*«старэюць людзі, дрэвы і кусты, // прыродны рух – ён і суддзя, і сведка»* («Старэюць людзі, дрэвы і кусты…»)), то пра каханне, яго ролю ў жыцці чалавека (*«Каханне і прынізіць, і... ўзніме, // пакуль у ім жыве душа мая»* («Казаў мудрэц»)), то пра тое, як трэба жыць, каб пакінуць пасля сябе яркі след (*«Няма фальшывых, што жывуць без позы... – // ёсць свет // і розны погляд на жыццё»* («Як часта ў свеце, бы ў бязладнай хаце…»)), то пра мастацтва і паэзію, іх прызначэнне (*«Ты дадаеш бяздумным пустаты, // разумнікам не дадаеш гарэння»* («Паэзія»)), пра сэнс чалавечага жыцця і горыч адзіноцтва *(«Хто і як, і прад кім награшыў, // не развяжа ніякае веча. // Засынаеш – так многа душы, // а прачнешся і ўздрыгнеш – пустэча!»* («Васьмірадкоўі апошніх пацалункаў»)).

Раіса Баравікова паўстае ў падобных творах, асабліва ў вершах цыкла «Васьмірадкоўі апошніх пацалункаў», паэтам-філосафам, які ўдумліва пазнае сябе і свет, спасцігае складаныя праблемы чалавечага існавання, паспяхова працягваючы традыцыі медытатыўнай элегіі, цэнтральны нерв якой складаюць пакуты і перажыванні сумленнага чалавека, які бачыць, як драбнеюць людзі, іх пачуцці, як паддаюцца яны спакусе лёгкага і бяздумнага жыцця.

Скіраванасць на маналагічную спавядальнасць, рэфлексіўнае асэнсаванне і разуменне ўласнай асобы і свайго месца ў свеце выяўляецца ў творчасці многіх паэтаў, сярод якіх асаблівае месца займае Ніна Мацяш, творчасці якой характэрная пэўная эвалюцыя ў лірычнай танальнасці: паэзія эвалюцыянавала ад апісальнасці, пачуццёвага, эмацыйнага ўспрымання рэчаіснасці да задуменнасці, аналізу, рэфлексіі, пошуку адказаў на вечныя пытанні.

Творчы шлях Ніны Мацяш ад першага зборніка («Агонь» (1970), з яго лейтматывам дапамогі кожнаму, хто блукае ў поцемках і мае патрэбу ў святле і цяпле да апошняга («У прыгаршчах ветру» (2009)) палягае праз шчырае ўвасабленне перажытага, праз замацаванне жыццёвага плёну ў эстэтычную матэрыю мастацтва.

Ужо ў зборніку «Агонь» акрэсліўся пошукавы характар паэзіі Ніны Мацяш, аднак гэта не столькі пошук стылю, колькі імкненне да сінтэзу паміж пачуццём і думкай, рацыянальным і эмацыянальным пачаткам. «Спачатку споведзь душы выяўлялася ў прадметнасці, увазе да канкрэтыкі, да найдрабнейшых прыкметаў зямнога жыцця, апісанне разгортвалася ўшыр, па гарызанталі, захоплівала (ахоплівала) значную прастору. Пасля, асабліва з 80-х гадоў XX стагоддзя, гарызонты светапазнання звужваюцца, погляд паэткі засяроджваецца на дамінантных кропках чалавечага жыцця, сягае ў глыбіню, разгортваецца ў вертыкальным вымярэнні» [6, с. 151], – справядліва з гэтай нагоды зазначае М.І. Мішчанчук.

Апісальнасць і адносную прадметнасць першага зборніка Ніна Мацяш імкнецца пераадолець, ставячы перад сабой нялёгкую задачу, тэндэнцыя да вырашэння якой стане дамінантнай у кожнай наступнай кнізе: паспрабаваць разгадаць «таямніцу» чалавека, сутнасць яго прызначэння. Менавіта таму паглыбленне медытатыўнага пачатку стала асноўнай адзнакай стылю Н. Мацяш. Лірычнаму «я» паэткі ўласціва

імкненне да аднаўлення сувязей паміж рознымі хуткаплыннымі праявамі жыцця, пошук магчымасцей гарманічнага існавання.

Зборнік «Удзячнасць» характарызуецца зваротам да спасціжэння законаў існавання, якія дапамаглі б упарадкаваць жыццё: *«Што след наш тут – след па'расе, / Што вечны тут адны пытанні...»* [7, с. 51].

Медытатыўнасць лірыкі Ніны Мацяш падчас набывае эталагічны характар, што выяўляецца ў першую чаргу ў трапных назіраннях над рознымі выпадкамі з жыцця чалавека, якія, нібы мазаіка, складаюцца ў аб'ёмную карціну свету, дзе ўсё рухаецца, няспынна змяняецца, набывае новыя якасці. Лірычная гераіня паўстае чуйнай, рэфлексуючай асобай, якая прыходзіць да высновы, што выпадковасці няма, нішто не знікае бясследна ў сусвеце: *«Зернейку трэба загінуць у чорнай раллі, / Каб выжыць...»* [8, с. 134].

Калі дамінантнай рысай паэтычнага радка Ніны Мацяш у ранні перыяд творчасці з'яўляецца жыццесцвярджальнасць, то пазнейшае заглыбленне ў медытатыўнасць і ў адлюстраванне ўласнага існавання спараджае ў лірычнай гераіні патрэбу асэнсаваць экзістэнцыйную сітуацыю наканаванасці з яе адчуваннем трагізму быцця: *«Чым больш пакут, тым болей сіл трываць»* [8, с. 188].

На думку даследчыкаў, новай рысай сучаснай паэзіі «стаў зварот беларускіх паэтаў да рэлігійна-хрысціянскай і біблейска-філасофскай тэматыкі. <...> Імя Бога вярнулася ў нашу паэзію як сімвал духоўнага выратавання і заступніцтва. Бог, пошук Боскага ў чалавечым існаванні, прага ачышчэння, чалавекалюбства, далучэнне душы да вечнага, хрысціянскага, усяго святога – вось тое кола матываў, якое вызначае змест твораў рэлігійна-духоўнай скіраванасці» [9, с. 59–60]. Асаблівасцю новай мастацкай свядомасці з'яўляецца адчуванне майстрамі слова адсутнасці ярка выражанага памежжа паміж Жыццём і Смерцю. І ў сувязі з гэтым многія сучасныя аўтары – А. Разанаў, Р. Барадулін, Н. Мяцяш, І. Багдановіч, Д. Бічэль, М. Шайбак, А. Мінкін, А. Глобус і інш. – разглядаюць смерць не толькі і не столькі як фізіялагічны канец чалавека, а як своеасаблівы пераход яго ў іншае часавае вымярэнне. Падобнае тлумачэнне сутнасці смерці, выкліканае эсхаталагічным настроем, уласціва постмадэрнісцкаму напрамку сусветнай, у тым ліку і беларускай, літаратуры ў цэлым.

Біблейскія матывы напоўніцу адлюстраваліся ў большасці твораў зборніка «Богава дрэва», які характарызуецца імкненнем лірычнай гераіні да пераадолення безвыходнасці і трагічнасці, разломнасці існавання. Ніна Мацяш прыходзіць да высновы, што *«любоўю толькі можна стому, / жыццё і скон свой апраўдаць»* [10, с. 7]. Удумлівы аналіз рэчаіснасці, імкненне абстрагавацца ад будзённасці штурхае паэтку да роздуму над пытаннем *«дзеля чаго Ты, Божа, / з неба звёў мяне ў бездарожжа?»* [10, с. 23]. На думку паэткі, змірыцца з непазбежнымі стратамі, хваробамі, няўдачамі (*«у які бок жыцця ні гляну – / і воддаль, і побліз – / смутку і смутку паляны»* [10, с. 23]) можа толькі сапраўдны хрысціянін, які адчувае, што *«шчасце – трыванне»* [10, с. 23]. Трыванне, і цярпенне – асноўныя духоўныя вартасці, якія чалавек набывае з дня ў дзень. Толькі таму, хто навучыўся трываць, даецца ўнутранае веданне (*«недзе ўзважваецца наш унёсак / у Жыцці / ў зямной гэтай юдолі»* [10, с. 48]) і ўпэўненасць у правільнасці абранага шляху (*«сіл даецца роўна столькі, колькі трэба, каб стрываць пакуту»* [10, с. 27]). Жыццёвая мудрасць бярэ вытокі з адзіна правільнага і магчымага спосабу існавання – рабіць дабро, не адкладаць на потым парываў міласэрнасці, добрага слова ці ўчынку: *«Бойся спазніцца з харошым учынкам: / Тонка прадзецца жыццёвая ніць, / а ліха не спіць...»* [10, с. 45]. Паглыбленне ва ўласную «быційную» сітуацыю, самарэфлексія прыводзіць да разумення жыцця як пераадолення пакут, таму

Ніна Мацяш выходзіць на новы для сябе, хрысціянскі план разумення рэчаіснасці як пастаяннага самаахвяравання.

Медытатыўнасць як дамінантная жанрава-стылёвая адзнака лірыкі Ніны Мацяш апошніх гадоў (зборнік «У прыгаршчах ветру») абумоўлівае невялікі памер твораў, што сведчыць аб скандэнсаванасці думкі, глыбінным сэнсе паэтычных радкоў. Гэтым тлумачыцца і прысутнасць у зборніку вялікай колькасці верлібраў, якія не звужаюць светаўспрыманне ў пэўныя рамкі, а даюць большую прастору для выражэння думкі.

Зборнік напоўнены роздумам, успамінамі пра тых, хто сышоў у нябыт, прасякнуты спавядальнай інтанацыяй, таму і медытатыўнасць, якая выявілася ў ім найбольш выразна ў параўнанні з папярэднімі кнігамі, носіць у асноўным мінорна-трагічны характар.

Напрыканцы жыцця, пераадольваючы душэўны боль, Ніна Мацяш прыходзіць да ўсведамлення «бездані» асабістага лёсу (верш «Белая поўня»), што выклікае ў яе адчуванне духоўнай еднасці з іншымі асобамі, прагі дапамогі, увагі, узаемапаразумення, таму невыпадкова ў зборніку з'яўляюцца вершы-прысвячэнні і згадкі пра важных для паэткі людзей. У вершы «Памяці Жэні Янішчыц» Н. Мацяш зазначае: «*Мінае ўсё, а жаляў і любові / час не ссячэ...*» [11, с. 25].

Падсвядомае падагульненне жыццёвага шляху выразна выяўляецца ў адным з самых моцных вершаў – «На Дзяды»:

*Поначнае ваколле.*
*Гразкае, слізкае поле.*
*За гэтым нявеtлым гародам –*
*Усе з найбліжэйшага роду.*
*Мусова і мне туды.*
*Грузну ў калкай разоры.*
*Не страх апякае, а сорам.*
*Страху няма й на волас.*
*Дотык рукі, мамін голас:*
*– Ступай у мае сляды.* [4, 18].

У апошнім зборніку Ніна Мацяш разважае над вечнымі пытаннямі: ці правільна, ці годна яна прайшла свой шлях, ці змагла вырвацца з палону будзённасці ў вышэйшую духоўную сферу, каб «сорам не апякаў», падкрэслівае, што правесці жыццё ў пошуку і дасягненні міфічных ідэалаў – марная справа, бо той самы ідэал – побач, варта толькі «зазірнуць у сябе».

Адчуванне сябе пакінутай і адзінокай на крохкім краі жыцця абвастрае ўнутраны зрок паэткі, узнікае патрэба зазірнуць у іншы свет. І, як вынік, узнікаюць медытацыі, насычаныя развітальнымі матывамі, непазбежнасцю «ступання ў сляды», магчыма не толькі бацькоўскія, але і ў сляды духоўна блізкіх людзей.

Імкненне да ўласнай душэўнай гармоніі, прага самаўдасканалення прыводзіць Ніну Мацяш да пытання, якое незаўважна хвалявала яе ўсё жыццё і толькі ў апошнім зборніку набыло акрэсленае моўнае выражэнне: «*А што там, у прадоніне душы / Адзінай чалавечае натуры?*» [4, с. 14]. Пошук адказу на гэтае пытанне і з'яўляецца вызначальным акцэнтам у медытатыўнай лірыцы паэткі.

Жыццё, на думку Раісы Баравіковай і Ніны Мацяш, уяўляе сабой бінарную апазіцыю быцця і небыцця, вечнага і часовага, вялікага і малога. Паэтычны шлях такіх непадобных і такіх блізкіх па стылі паэтак пралягае ад выяўленчасці і апісальнасці да медытатыўнай заглыбленасці, ад разгубленасці і няўпэўненасці да супакаення, адкрыцця ўласнай непаўторнасці. Медытатыўнасць, асацыятыўнасць мыслення, імкненне зразумець заканамернасці жыцця і перадаць іх у маляўнічых, дакладных вобразах характарызуюць творчыя пошукі Раісы Баравіковай і Ніны Мацяш.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Хализев, В.Е. Лирика / В.Е. Хализев // Литературное произведение: Основные понятия и термины : учеб. пособие / Л.В. Чернец, [и др.] ; под ред. Л.В. Чернец. – М. : Высш. шк.: Академия, 2000.
2. Поспелов, Г.Н. Лирика: Среди литературных родов / Г.Н. Поспелов. – М. : Изд-во Моск. гос. ун-та, 1976.
3. Поспелов, Г.Н. Проблемы исторического развития литературы / Г.Н. Поспелов. – М. : Просвещение, 1972.
4. Есин, А.Б. Психологизм / А.Б. Есин // Литературное произведение: Основные понятия и термины : учеб. пособие / Л.В. Чернец [и др.] ; под ред. Л.В. Чернец. – М. : Высш. шк.; Изд. центр «Академия», 2000.
5. Баравікова, Р.А. Дрэва для райскай птушкі : лірыка / Р.А. Баравікова ; прадм. І. Штэйнера. – Мінск : Маст. літ., 2007.
6. Мищенчук, Н.И. Русская и белорусская литературы XIX–XX столетий: жанрово-стилевой аспект, вопросы взаимодействия : монография / Н.И. Мищенчук. – Брест : Изд-во БрГУ, 2005.
7. Мацяш, Н. Паміж усмешкай і слязой / Н. Мацяш. – Мінск : Маст. літ., 1993.
8. Мацяш, Н. Душою з небам гаварыць : выбр. лірыка / Н. Мацяш. – Мінск : Маст. літ., 1999.
9. Бельскі, А.І. Паэзія / А.І. Бельскі // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – Т. 4. Кн. 2 : 1986–2000. – С. 39–87; навук рэд. У. В. Гніламёдаў [і інш.]
10. Мацяш, Н. Богава дрэва / Н. Мацяш. – Мінск : Про Хрысто, 2004.
11. Мацяш, Н. У прыгаршчах ветру / Н. Мацяш. – Мінск : Літ. і Мастацтва, 2009.

***Govzich I.M., Makarevich K.T.* Signs of Meditativeness in Creative Works by Raisa Borovikova and Nina Matyash**

The article investigates meditatıveness as a sense-making dominant of the lyrics of Raisa Baravikova and Nina Matyash. On the basis of the books of P. Baravikova's poems «Tree For the Paradise Bird» and N. Matyash's «God's tree», «Speaking to the sky with soul», «Between smile and a tear», «In the handful of wind» the authors come to the conclusion that the reflection of the thoughts and feelings of the authors, their movement, the changes are characteristic of both poets. The degree of realization of meditativeness of R. Baravikova and N. Matyash are expressed in two aspects: its descriptivness with signs of meditatıveness, and «pure» meditation.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 3.02.2011